

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*№ 3 (214) 5 мая 1994 года, чацвер*

## Гэта падзея ва ўсім славянскім свеце

Без перабольшвання, выдатнай падзеяй у гісторыі беларусістыкі стаў выхад новай кнігі прафесара нашага універсітэта Івана Якаўлевіча Лепешава, якая называецца: «Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы». Гэтае выданне ў двух тамах надрукавана ў выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя». Кніга — плён дваццацігадовай працы Івана Якаўлевіча. Тытанічнай, самаахвярнай працы. Аб гэтым гаварылася на прэзентацыі слоўніка, якая адбылася на факультэце беларускай філалогіі і культуры.

Т. Тамашэвіч, загадчык кафедры беларускай мовы, назваў кнігу ўнікальнай, фундаментальнай рэччу. Фразеалагічны слоўнік гродзенскага даследчыка мае перавагі над аналагічнымі выданнямі расійскіх, польскіх, украінскіх аўтараў. І такую працу здзейсніў адзін чалавек. Т. Тамашэвіч глыбока падзякаваў Івану Якаўлевічу за гэтую кнігу.

Прыемна было чуць добрыя словы ў адрас прафесара Лепешава і ад яго вучня, дацэнта М. Даніловіча. Ён сказаў так: «Гэта падзея ва ўсім славянскім свеце, бо такога слоўніка ў іншых народаў няма. Мы павінны ганарыцца гэтым чалавекам: ён праславіў Гродзеншчыну». Калі азірнуцца ў мінулае, то на Гродзеншчыне працавалі Саламон Рысінскі, Яўхім Карскі, Міхаіл Федароўскі. Гэтыя традыцыі працягвае Іван Якаўлевіч Лепешаў.

Першы прарэктар універсітэта А. Краўцэвіч ад усяго сэрца пажадаў прафесару Лепешаву плёну ў працы, адзначыў вялікае значэнне фразеалагічнага слоўніка для навукі.

Загадчык кафедры беларускай культуры А. Пяткевіч эмацыянальна сказаў так: «Каб не было такіх апантаных людзей, свет застаўся б на пячорным узроўні». І яшчэ пра слоўнік: «Ён адкрывае адценні хараства нашай мовы, якая творыцца народам».

Свае ўражанні ад кнігі выказалі і дэкан філалагічнага факультэта Л. Рычкова, кандыдат філалагічных навук М. Якалцэвіч, дэкан факультэта беларускай філалогіі і культуры І. Жук.

А ў заключэнне выступіў сам сціплы аўтар амаль дваццаці кніжак, чалавек надзвычайнай працавітасці і мэтанакіраванасці. Ён расказаў, што «у запасніку» ляжыць яшчэ некалькі рукапісаў, чакаюць свайго часу.

Ці не прыклад гэта для маладых навукоўцаў?

**В. МЯЦЯВІЦКІ.**



## Запрашаюць тых, хто любіць птушак

«Штаб-кватэра» новай грамадскай арганізацыі,— Заходнебеларускага таварыства аховы птушак,— знаходзіцца на біялагічным факультэце універсітэта. Прэзідэнт таварыства — выкладчык біяфака Аляксандр Вінчэўскі.

Новай справай ён здолеў зацікавіць і студэнтаў. Грамадская арганізацыя праводзіць арніталагічныя акцыі і даследаванні, супрацоўнічае з замежнымі арганізацыямі.

Тых, хто хацеў бы далучыцца да таварыства, з энтузіязмам сустрэнуць на трэцім паверсе біялагічнага факультэта, дзе ў адной з аўдыторый звычайна праходзяць пасяджэнні арнітолагаў.

**С. ВАСІЛЕВІЧ.**

## Хто ў нас вучыцца?

У межах пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам нацыянальнай адукацыі Рэспублікі Польшча ў нашым універсітэце навучаюцца выпускнікі ліцэяў з Беласточчыны. Сярод іх пяць філолагаў, адзін гісторык, сем чалавек на факультэце фізічнай культуры, пачфаку — шэсць, юрыдычным (МЭА) — два і адзін на факультэце беларускай філалогіі і культуры.

На дагаворнай аснове на падрыхтоўчым аддзяленні для замежных студэнтаў і на асноўных факультэтах універсітэта навучаюцца сем мараканцаў, два студэнты Лівана, восем пакістанцаў, адзін з Ізраіля, адзін з Нідэрландаў, па аднаму з Грэцыі і Бельгіі і два з Камеруна.

Ёсць нават адзін аспірант з Кітая, які займаецца вывучэннем юрыспрудэнцыі.

**Л. БАБРОЎНІК,**
**в. а. загадчыка аддзела маркетынгу.**

## Лепш пазней, чым ніколі

падумалі на філфаку і вырашылі (хоць і з катастрафічным спазненнем) усё ж правесці рытуал пасвячэння ў студэнты. Відаць, былі пэўныя сумненні: калі так зацягнулі гэтую працэдуру. Тым не менш, рашыліся і... не прагадалі.

Урачыстасць праходзіла ў актавай зале універсітэта. Сабраліся тут не толькі філфакаўцы, але і прадстаўнікі іншых факультэтаў, якіх прывабіла арыгінальная праграма вечарыны. Агіттэатр філфака (створаны нядаўна) паказаў усё, на што здольны. Далёка не шэраговыя студэнцкія «таленты» разыгралі мініяцюры з паўсядзённага універсітэцкага жыцця. Былі і жарты, і анекдоты, і нават «сеанс шокатэрапіі», які правёў зграбны танцавальны рытм-дуэт.

А пасля такой узмоцненай гумарыстычнай падрыхтоўкі студэнты адразу трох курсаў прынялі прысягу на вернасць факультэту і не могуць цяпер называцца «нехрысцямі».

**П. ЖАЛЯЗНЯК.**

## Чытайце, студэнты: цікавы часопіс

Амаль праз шэсць дзесяцігоддзяў адноўлены беларускі часопіс «Калосьсе», які ў трыццатыя гады выходзіў у Вільні.

Першы,— пасля доўгага перапынку,— нумар часопіса выдадзены на Віцебшчыне, у Паставах, Беларускім таварыствам вольных літаратараў. У ім друкуюцца творы маладых гродзенскіх паэтаў Юрася Пацюпы і Юры Гумянюка. Ёсць публікацыя старшыні гродзенскай краязнаўчай асацыяцыі Андрэя Майсяёнка пра славутага беларуса, акадэміка астранаўтыкі Барыса Кіта.

Часопіс «Калосьсе»,— як пішацца ў рэдакцыйным артыкуле,— павінен даць «прастору для новых мастацкіх адкрыццяў».

**М. ЯСЕНЯЎ.**

## Збіраюцца, каб вызначыцца...

«Праблемы беларускай навуковай тэрміналогіі»,— такая назва нацыянальнай канферэнцыі, якая пройдзе 4—6 мая ў Мінску. Праводзяць яе Міністэрства адукацыі краіны, Акадэмія навук, Таварыства беларускай мовы, «Беларуская энцыклапедыя».

Арганізатары запрашаюць усіх зацікаўленых да ўдзелу ў канферэнцыі. Матэрыялы яе будуць выдадзены асобным зборнікам.

Адрас аргкамітэта: 220 005, Мінск, вуліца Румянцава, 13.

Тэлефоны: 33-25-11 і 39-50-61.

**М. ПЯТРУСЕЎ.**

## Наша справа — прапанаваць

Прафкам універсітэта прапаноўвае ўсім жадаючым набыць міжнародны студэнцкі білет ISIC, які дае ўладальніку права на шэраг ільгот: да 40 працэнтаў кошту на авіябілеты для асобаў да 24 гадоў; 25—40 працэнтаў на чыгуначныя білеты для асобаў да 26 гадоў; да 40 працэнтаў на чыгуначныя білеты на міжнародныя маршруты ў 2000 гарадоў, што ў Еўропе, для асобаў да 26 гадоў; бясплатнае ці 50 працэнтаў ад кошту на наведванне музеяў, галерэяў і г. д.; на тавары 8—10 працэнтаў; на аплату пражывання ў міжнародных маладзёжных гатэлях, універсітэцкіх і інстытуцкіх інтэрнатах. Кошт міжнароднага студэнцкага білета — 4 даляры.

## Усё пра нашу Беларусь

«Вялікі гістарычны атлас Беларусі» рыхтуюць цяпер інстытуты гісторыі АН Беларусі разам з вытворча-камерцыйнай фірмай «Арт-Фэкс». Гэта будзе фундаментальны картаграфічны твор у пяці тамах.

Галоўная мэта — стварыць картаграфічную панараму шматвекавога шляху нашай радзімы.

«Вялікі гістарычны атлас Беларусі» стане багатай крыніцай самай рознай інфармацыі аб прыродным асяроддзі, гаспадарчым развіцці, палітычных падзеях і духоўным жыцці на беларускіх землях. Упершыню будзе прадстаўлены працэс фарміравання тэрыторыі нашай краіны, яе асобных адміністратыўных адзінак у буйным маштабе, не будзе пакінуты па-за ўвагай ніводзін з існуючых ці існаваўшых населеных пунктаў.

## Засядала Вучоная рада

1.04.94 г. адбылося чарговае пасяджэнне Вучонай рады універсітэта. На ім былі разгледжаны наступныя пытанні: аб некаторых напрамках перспектыўнага развіцця універсітэта; аб стане вучэбна-метадычнай працы на філалагічным факультэце; зацвярджэнне вучэбнага плана ФДП; зацвярджэнне плана аб імянных стыпендыях.

З мэтай удасканалення навучальнай і навукова-даследчай працы вырашана правесці структурныя змены на факультэтах. Вучоная рада пастанавіла стварыць на базе гістарычнага факультэта і кафедры беларускай культуры факультэт гісторыі і культуры (дэкан факультэта — В. М.Чарапіца).

Кафедру інжынерна-тэхналагічнай падрыхтоўкі інжынернага факультэта вырашана ператварыць у кафедру матэрыялазнаўства і рэсурсазберагальных тэхналогій (заг. кафедры В. А. Струк). На інжынерным факультэце створана кафедра інжынерна-тэхнічнай падрыхтоўкі.

З 02.04.94 г. пачаў дзейнічаць фізіка-тэхнічны факультэт на базе фізічнага і інжынернага факультэтаў (дэкан Г. А. Гачко).

У сувязі з неабходнасцю ўдасканалення сістэмы навучання замежным мовам студэнтаў розных спецыяльнасцей і адкрыццём у 1994/95 навучальным годзе падрыхтоўкі спецыялістаў па англійскай, нямецкай і французскай мовах, Вучоная рада ГрДУ пастанавіла ўвесці ў склад філалагічнага факультэта агульнауніверсітэцкую кафедру замежных моваў.

З мэтай удасканалення сістэм кіравання фізічным выхаваннем, аховай здароўя, масавай фізічнай культурай агульнауніверсітэцкая кафедра фізічнага выхавання ўведзена ў склад факультэта фізічнай культуры. Кіраўніцтва ўсім працэсам фізічнага выхавання і падрыхтоўка спартсменаў высокага класа ажыццяўляецца дэканам факультэта фізічнай культуры.

Заслухаўшы справаздачу дэкана філалагічнага факультэта Л. В. Рычковай і інфармацыю загадчыка вучэбна-метадычнага аддзела Л. У. Бярэйшык «Аб стане вучэбна-метадычнай працы на філалагічным факультэце», рада адзначыла, што ў навучальным працэсе на філалагічным факультэце значная ўвага надаецца вучэбна-метадычнай працы. Маюць месца некаторыя недахопы: навучальны працэс недастаткова забяспечаны навейшымі тэхнічнымі сродкамі, слаба выкарыстоўваюцца дзейнічаючыя ТСН, шэраг курсаў і спецкурсаў не забяспечаны ў дастатковай меры вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратурай. У шэрагу выпадкаў пратаколы не даюць падставы меркаваць аб змесце і напрамках абмяркоўваемых пытанняў, а носяць канстатуючы характар.

Вучоная рада пастанавіла прысвоіць імянную стыпендыю імя Леніна студэнту 5 курса І групы фізічнага факультэта Максімовічу Вячаславу Аляксандравічу, які здаў зімовую экзаменацыйную сесію на выдатна і прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці факультэта.

**Н. БЕДЗЬ.**

# І БЫЛА НА ФІЛФАКУ ПРАКТЫКА...

*Першая педагагічная практыка для студэнтаў IV курса рускага аддзялення філфака. Усё ўпершыню. Нялёгка раптам з вучня ператварыцца ў настаўніка, нялёгка навучыцца выкарыстоўваць усё, што ведаеш, і шмат іншага «нялёгка».*

*Былі засмучэнні і радасці, былі няўдачы і адкрыцці; усё было. Цяпер гэта ў мінулым.*

*Цешыць галоўнае — мы гадуем цудоўных настаўнікаў, адданых сваім вучням, якія любяць свой прадмет. Нашы будучыя настаўнікі засвоілі галоўнае, аб чым пісаў Л. М. Талсты: «Хочешь наукой воспитать ученика — люби свою науку и знай ее, и ученики полюбят науку, и ты воспитаешь их».*

*Мы радыя за вас, дарагія нашы вучаніцы. Няхай тое, што вы з юнацкім максімалізмам так стараліся ўвасобіць у сваіх уроках, застанецца з вамі на ўсё жыццё.*

*Аб тым, што для студэнта азначае першая практыка, расказваюць яны самі.*

**Г. ЖДАНЕНЯ,**
**ст. выкладчык кафедры рускай мовы, факультэцкі кіраўнік практыкі.**



## «Я хацела, каб кожны ўрок быў натуральным працягам жыцця»

Дзеці... Колькі дарослых на зямлі, столькі і меркаванняў думкаў, уяўленняў аб іх: яны ж такія розныя. З якімі пачуццямі, перажываннямі, сумненнямі ішла я на практыку. Дзеці — гэта асобы свет, са сваімі законамі і правіламі. Як сустрэне мяне гэты свет, што я сама магу ў яго прынесці, чым узбагаціць? Што ёсць у мяне такое, чым можна зацікавіць дзяцей, павесці за сабой? Ці схіляцца да мяне дзіцячыя сэрцы?

Такія думкі ўвесь час хвалявалі мяне перад практыкай. Перш за ўсё, лічыла я, патрэбна наладзіць кантакт з дзецьмі. Я хацела, каб кожны ўрок быў сапраўдным працягам іх жыцця, каб званок не адмежаваў дзяцей ад іх жаданняў і імкненняў, ад іх інтарэсаў, не абмяжоўваўся строгімі правіламі рускай граматыкі.

Першае маё ўражанне ад класа: якія яны ўсе розныя! Колькі самых розных характараў! Такія непасрэдныя і адначасова такія непрадказальныя! Таму і разгубілася на першым уроку, і голас дрыжаў, і не магла знайсці месца рукам. Бо кожны з іх, што сядзіць за партай, акуратна склаўшы рукі, глядзіць на цябе сваімі вачыма, у кожнага — свае думкі. Вось сядзіць Даша і думае: «Я, як заўсёды, нічога не згублю з таго, чаму будзе вучыць новая настаўніца, і пакажу сябе з лепшага боку». Можа, новая настаўніца злітуецца і паставіць пару «чацвёрак», каб бацька не крычаў на мяне», — думае Юра. А я стаю перад імі адна і расказваю аб лічэбніках. Цяжка давалася гэтая тэма. І — ох як! — не ўзнімалася рука ставіць «двойкі». Пераконвала сябе і іх: «У вас абавязкова ўсё атрымаецца! Вы толькі вучыцеся». А каб цікавей было, спрабавала наладжваць конкурсы, давала творчыя заданні. Любяць дзеці ўсё незвычайнае. Вось і першы вывад на будучае. А яшчэ дзеці любяць, калі настаўнік бачыць кожнага з іх. Таму і хочуць працаваць па картках, каля дошкі.

Рознымі былі ўрокі. Адныя — імклівыя і бурныя, другія — плаўныя і спакойныя. А як у іншых? Мне здаецца, усе мае сяброўкі знайшлі сябе, свой вобраз настаўніка. Вось Наташа Гільдзюк — з адкрытай усмешкай гаворыць свайму вучню: «Як цікава ты расказаў!» І хлопчык мімаволі пачынае з гордасцю глядзець на іншых.

А Юля Журко роўным і метадычным голасам, адабраючы адказ вучня, гаворыць: «Згодна». І перад намі размова на роўных двух чалавек, аднолькава маючых права на свае думкі.

Жана Зарэцкая. Урок-конкурс. Дзеці адчувальна шапацяць падручнікамі і сшыткамі, зацікаўлена пераговорваюцца, а ў вачах — азарт: «Я хачу, я магу быць першым». І ў гэты момант настаўніца для іх — вышэйшы суддзя, ад якога залежыць апошняе слова. А як важна ацаніць аб'ектыўна веды дзяцей! «А чаму вы Сашы паставілі «5», ён сказаў толькі адно слова, а я шмат адказвала, але вы мне нічога не паставілі?» І патрэбна тлумачыць, што іншы раз адно слова — на вагу золата.

Шмат цяжкасцей у школе, таму і памятаю кожную заўвагу Яўгеніі Ільінічны Кандратовіч, кіраўніка нашай групы, бо гэта парады на час будучай працы ў школе, а, значыць, на ўсё жыццё.

У цэлым, мне здаецца, школа не запалохала сваімі цяжкасцямі, а зацікавіла сваім асаблівым светам, які не сустракаецца больш нідзе.

**Ж. ЯНКОЎСКАЯ,**
**СШ № 10.**

## Школа — загадкавы і дзіўны свет

Школа... Такое загадкавае і дзіўнае слова. Бо кожнаму, хто ідзе ўпершыню на практыку, важна тое, як прыме яго школа, што адкрые яму. Чаго больш убачыць ён: добрага ці дрэннага? Гэтыя пытанні не давалі супакоіцца і мне.

Спачатку было страшна. Потым — усё цікавей. Тыдзень, прызначаны для таго, каб лепш пазнаць дзяцей, палюбіць іх, прайшоў непрыкметна. Кожны дзень быў невялікім адкрыццём іх характараў, поглядаў. Але калі ты проста наведваеш урокі, ты яшчэ нічога не ведаеш аб школе, ты яшчэ не настаўнік, ты яшчэ не можаш зрабіць выбар.

Першы ўрок...

Празвінеў званок. Усе вучні ўсталі, чакаюць. Настаўніца тлумачыць ім, што ў мяне першы ў жыцці ўрок.

Бачу толькі мноства вачэй. Светлых, уважлівых, дапытлівых — які ў яе ўрок атрымаецца — і добразычлівых. Але ўсё ж вельмі страшна. Страшна падмануць спадзяванні дзяцей, страшна «не спадабацца» метадысту, настаўніку і студэнтам-практыкантам.

Здаецца, пара нешта сказаць. Так, спачатку прывітацца і абвясціць тэму ўрока. І тут я разумею, што зараз адчуваю сябе ў іншым свеце. Для мяне не існуе ні настаўніка, ні метадыста. Ні таго, што робіцца за сценамі класа. Толькі мае думкі, мая ўсмешка, мае вочы і мора, велізарнае мора іншых вачэй, усмешак, адказаў — гэтых дапытлівых і добразычлівых твараў. Быццам бы купаешся ў гэтым дзіўна цёплым, светлым моры, моры чалавечых пачуццяў, ловіш кожнае слова, раскрываешся цалкам, спрабуеш нешта растлумачыць, зацікавіць, нешта... Званок. Уф! Знікла гэтае вядзьмарства. Зноў на грэшнай зямлі. Але вочы і ўсмешка тыя ж. І пачынаеш разумець — так, гэта і ёсць праца настаўніка. І чым лепш ты ведаеш дзяцей, тым цяплей гэтае мора, тым вастрэй жарты і гучней смех, тым хітрэй вочы і прыгожае слова...

Школа... Так, гэта такі загадкавы, дзіўны свет!

**А. ШАЛЕСНАЯ,**
**СШ № 25.**

## А. Я. Чайко: «Чым больш аддаеш, тым больш артымліваеш...»

### Размова з настаўніцай СШ № 21, метадыстам А. Я. Чайко

Пакутлівыя хваляванні, цяжкія перажыванні — ўсё тое, чым звычайна суправаджаецца першая педагагічная практыка ў школе, ужо ў мінулым. У мінулым праца над канспектамі, праверка сшыткаў, апрацоўка дыдактычнага матэрыялу і шматшмат іншага. Зноў патрэбна перавучвацца з 45-хвілінных заняткаў на 1,5-гадзінныя, з першай змены на другую.

І зараз хацелася б яшчэ раз ад усяго сэрца падзякаваць А. Я. Чайко, В. П. Паўлючык, Л. С. Чарняўскую і многіх іншых, хто дапамагаў нам рабіць першыя крокі ў новай, вельмі складанай ролі настаўніка. Сваёй патрабавальнасцю і ўвагай яны не дазволілі ні на хвіліну паслабіцца перад цяжкасцямі сваімі слушнымі заўвагамі і прапановамі, вучылі нас высокаму прафесіяналізму. Мы задалі некалькі цікавых для нас пытанняў кіраўніку нашай практыкі ў школе № 21 А. Я. Чайко, і яна з задавальненнем падзялілася з намі сваімі думкамі.

**— Ала Яўгенаўна, Вы педагог з вялікім стажам, настаўнік, які валодае вялікім педагагічным майстэрствам. Падзяліцеся, калі ласка, самым прыемным успамінам за ўсе гады Вашай працы.**

— Я тады была, здаецца, маладзейшай і лепшай. Памятаю адзін дзень зімы правяла разам з дзецьмі-выпускнікамі. Вось тады мне пашчасціла зведаць, як дзеці ўдзячныя табе, калі ты іх разумееш, паважаеш, калі ты ім адданы. Іншых адносін з боку класнага кіраўніка быць не можа. Так многія гады і працавала, аб чым ніколі не шкадавала. Сапраўды, «чым больш аддаеш, тым больш атрымліваеш».

**— Чым жыве сёння сучасная школа? Якое становішча 21-ай школы, ці змянілася яно з таго часу, як Вы прыйшлі сюды ўпершыню?**

— Сёння школа адзіны востраў, дзе гавораць аб ролі ведаў, культуры, дзе яшчэ памятаюць традыцыі народнай педагогікі. І гэта тычыцца больш настаўнікаў старэйшага пакалення.

Моладзь, мне здаецца, трапіўшы на гэты востраў, будзе першы час востра адчуваць, як хвалі жыццёвага акіяна больш і больш ахопліваюць тэрыторыю вострава. Салёныя і халодныя кроплі не кожнаму чалавеку да спадобы, не кожны ўпэўнена адчувае сябе на ільдзіне, калі па ёй бяжыць злавесная трэшчына... Але трэба працаваць, трэба перамагаць.

Зараз па другой частцы пытання. У школе № 21 я ўжо працую больш 10 гадоў. Асабліва ў апошні час адчуваю бядноту народнай адукацыі, нашу бядноту: кнігаў, часопісаў, абсталявання з кожным днём усё менш і менш. Але ўяўляю, што было б, калі б не бескарыслівасць настаўнікаў, якія робяць шмат намаганняў, каб захаваць, абнавіць тое, што ў нас маецца.

Спачатку ў школе № 21 цікавіліся выяўленчым мастацтвам, апошнія тры гады — паглыбленае вывучэнне хіміі, біялогіі, адкрыты харэаграфічныя класы, класы польскай мовы.

**— Што больш за ўсё цэніцца Вамі ў асобе настаўніка і які недахоп лічыце самым небяспечным у характары?**

— Самым важным і неабходным з'яўляецца спалучэнне высокага прафесіяналізму з разумным сэрцам, з добрай душой. Такіх педагогаў я сустракала нямнога, але менавіта яны дапамаглі мне заставацца настаўнікам.

Страшным і небяспечным у характары настаўніка з'яўляецца ганарлівасць, аўтарытарнасць.

**— І апошняе, невялікі наказ нам, яшчэ студэнтам, але будучым настаўнікам з вышыні Вашага вопыта.**

— Вельмі лёгка перайсці да адказу на апошняе пытанне. Я не прымаю сэрцам выказванне «з вышыні вопыту», бо настаўнік жыве да той пары, пакуль ён вучыцца.

Раю: вучыцеся патрабавальнай любові да дзяцей, верыць ім, быць адданымі таму, чаму вучыце, паважайце і беражыце ў сабе Настаўніка, заставайцеся ў любых умовах Чалавекам.

Я вам вельмі зайздрошчу: вы маладыя, у вас наперадзе будучае.

**— Дзякуй Вам, Ала Яўгенаўна, за цікавую размову. Моцнага Вам здароўя і вялікіх творчых поспехаў у Вашай нялёгкай працы.**

**Размаўлялі**
**М. Кухта, Н. Ковель.**

# І ўсё ж я стану настаўніцай...

*Урыўкі з дзённікаў*

**8 лютага.** Сёння першы раз у школе на ўроках у 8-м класе, з якім прыйдзецца працаваць больш за месяц. Урок рускай мовы. Клас падзяляецца на некалькі груп, у кожнай — свой кансультант, 4 вучні працуюць каля дошкі...

Адзін урок змяняе другі. Розныя ўрокі, розныя настаўнікі, розныя абставіны ў класе. Вельмі цікава за ўсім назіраць. З той пары, як я сама вучылася ў школе, нічога не змянілася. Іншай стала я, таму і гляджу на школьны свет з нейкім першародным здзіўленнем, нібы ўпершыню трапіла сюды...

**11 лютага.** ...Не ведаю, якімі будуць мае ўрокі. Ці атрымаюцца яны? Цешыць тое, што няма страху, што можна тварыць, шукаць сябе...

**14 лютага.** Асаблівы дзень. Я даю свой першы ўрок. Пачуццё спакою і ўпэўненасці...

Клас працаваў вельмі добра. А я, наслухаўшыся ўсяго аб іх, так баялася, што дзеці не будуць успрымаць новы матэрыял так, як я яго бачу і прапаноўваю ім, не змогуць назіраць, аналізаваць, рабіць вывады. Вельмі радая, што мяне зразумелі. Зрабілі ўсё, што запланавана. Цудоўныя дзеці!

**16 лютага.** Урок па развіццю мовы. Складаны, але, здаецца, атрымаўся...

Якая добрая работа ў **А. Ю.** Колькі болю ад страты сабакі. Дзяўчынка спрабуе падзяліцца ім, выказаць яго. Можа, ёй няма з кім пагаварыць? ...Дзіўна, але па-за ўрокам **А. Ю.** вельмі любіць пагаварыць, у яе многа сяброў. Чаму ж яна маўчыць на ўроках?

**24 лютага.** ...Так, **А. Ю.** — адна са слабейшых вучняў класа. Але чаму? Яна піша такія цудоўныя сачыненні, вельмі прыгожыя, шчырыя, умее карыстацца словам, каб перадаць, як сёння, прыгажосць наступаючай вясны. І чалавек яна вельмі цікавы. Чаму ж не адказвае? Чаму дрэнныя адзнакі?

**28 лютага.** ...**А. Ю.** упершыню падняла на ўроку руку. Гэта найвялікшая радасць для мяне сёння! Я так гэтага чакала! Няхай яна не зусім правільна адказала, але гэта не самае галоўнае. Хочацца верыць, што гэтая дзяўчынка, можа, не будзе больш сядзець на ўроку цішэй вады ніжэй травы.

**14 сакавіка.** Тры дні мы не бачыліся. Як радаваліся дзеці майму звароту! ...Загаварыў яшчэ адзін маўчун на ўроку! Гэта **С. Д.** Вельмі многа памылак робіць пры пісьме, але як стараўся сёння адказваць. Малайчына! **А. Ю.** атрымала сёння «4». Адказала амаль без памылак!

**19 лютага.** Можа, гэтага дзённіка мне акурат і не хапала ў жыцці...

...Дзяўчынкі падзяліліся са мной уражаннямі аб прачытанай нядаўна «Асі» Тургенева. Я ўспамінаю сябе ў школе, згадваю такое ж сваё дзіцячае ўспрыманне літаратурных твораў... Пачынаю разумець, што мы вучым дзяцей усяму, але толькі не ўменню разумець...

**28 лютага.** ...Здаецца, я чагосьці дасягнула! У канцы ўрока, прысвечанага апісанню помніка А. С. Пушкіну ў Маскве, **А. В.** спытала: «А як мне сказаць, што раней я бачыла гэты помнік у Маскве, але не звярнула ўвагі, а сёння зусім інакш на яго паглядзела?»

...Калі прыняць пад ўвагу тое, што кожны чалавек — люстэрка ў адносінах да другога, то людзі адносяцца да цябе так, як і ты да іх. Як ты паважаеш вучня, так і вучань паважае цябе.

**11 лютага.** Мне ўсё больш падабаюцца дзеці. Яны спакойныя, ураўнаважаныя, самастойныя. Вельмі дружныя... 13 гадоў. Дзяўчынкі сур'ёзныя, на хлопчыкаў глядзяць пагардліва. А хлопчыкам яшчэ хочацца гуляць, бегаць па калідорах.

**14 лютага.** Мой першы ўрок. Вельмі хвалявалася. Не пазнавала свайго голасу. Вельмі дапамагло тое, што ведаю ўсіх дзяцей па імёнах і хто на што здольны. З якім разуменнем аднесліся дзеці! Як яны дапамаглі сваёй настаўніцы-вучаніцы!..

**21 лютага.** Адчуваю ў класе сябе сапраўдным настаўнікам. Вучні лёгка ўсё ўспрымаюць. Вельмі прыемна, што яны хвалююцца за мае адзнакі і, што дзіўна, спакойна адносяцца да сваіх... Я стала іх вельмі любіць. Лёгка працаваць і з маёй настаўніцай **Л. М.** Які яна чулы і тактоўны чалавек!

**16 лютага.** Гэта жудасна! Я зруйнаваная! Няма ніякага жадання працаваць настаўніцай! На ўроку ніякай дысцыпліны! Я крычала на дзяцей! Я папракала іх у адсутнасці сораму, але каму, як не мне, павінна быць сорамна. Вядома ж, ім было сумна на ўроку...

**5 сакавіка.** У школе перадсвяточная мітусня.

...Празвінеў званок — і тут у клас забеглі ўсе нашы дзеці з букетамі кветак: адзін — настаўніцы, маёй **Н. А.**, другі — мне. Ды і паднёс мне іх мой любімец **В. Ж.**! Я на сёмым небе ад шчасця! Яшчэ б, гэта ж мае першыя Настаўніцкія кветкі!

**11 сакавіка.** Сёння, здаецца, пераломны момант у маёй настаўніцкай дзейнасці. На ўроку была цудоўная дысцыпліна. Мае вучні з задавальненнем займаліся тым, што я ім прапаноўвала. Як лёгка працаваць, калі цябе разумеюць.

**18 сакавіка.** Сёння — апошні мой урок... Вось і ўсё. Да пабачэння, мае шасцікласнікі. Сумна развітвацца са школай, з дзецьмі. Але я абавязкова вярнуся!

# Кулінарныя парады бабулі Галі

*(будучым паварыхам рускай мовы)*

1. Лепш на дасаліць, чым перасаліць, таму што лішак солі можа загубіць развіваючыяся маладыя арганізмы.

2. Кашу маслам не змарнуеш, таму не бойцеся пахваліць сваіх вучняў.

3. Як зварыш, так і з'ясі.

[illegible] Калі вы бачыце, што пірог гарыць, вы, вядома ж, хутчэй выключаеце газ. Так і на ўроку. Калі вы пачынаеце адчуваць сябе на месцы гарэлага пірага, то не чакайце, каб хто-небудзь выключыў вас. Зрабіце гэта самі.

5. Кожная справа выглядае апетытна, калі яна прыгожа афармлена. Дык няхай вашы ўрокі будуць прыгожымі, каб у вучняў разгуляўся апетыт.

Бабуля Галя вельмі любіць гатаваць, падпякаць, падсмажваць, каб пурок атрымаўся смачным, ну вельмі смачным. Яна яшчэ любіць прымаўляць: «Пурок павінен быць цікавым, непаўторным, рэзультатыўным». Майце на ўвазе: дакладнае выкананне рэцэпта можа прывесці да жаданых поспехаў толькі тады, калі паварыха добра ведае ўласцівасці апрацоўкі і ўмее ў час вызначыць гатоўнасць стравы. Шматразовыя навуковыя даследаванні студэнтаў-практыкантаў паказалі, што найлепшаму страваванню спрыяе 4-х разовы прыём ежы. Так што не трацце надзею, калі першы прыём ежы не ўздзейнічаў на вучняў.

**Прыкладнае меню:**

1. Салата «Адвага». Напусціць на сябе 5 кг упэўненасці, 10 кг раскаванасці і 110 кг вынаходлівасці і кемлівасці (можна прысыпаць перчыкам), перамяшаць і адважна ўрывацца ў клас.

2. Бацвінне (па-руску — щи) «Вадзяное». Любімая страва вучняў. Трэба ўзяць 5 л вады (можна крышачку солі). І варыць, варыць, варыць хвілін так 10—15, потым пераліць у другую каструлю і зноў варыць, варыць... Працэс паўтараць па меры неабходнасці.

3. Фаршмак з мазгоў. Менш паважаная вучнямі страва. Падрыхтаваныя мазгі прапусціць праз мясарубку, прыбавіць памяць і арфаграфічную пільнасць, усё перамяшаць. Атрыманы фарш пакласці на бляху, абкласці слоўнікамі і падручнікамі, паліць практыкаваннямі і крыху пасыпаць арфаграфічнымі памылкамі. Запячы ў духоўцы. Дастаць на сшытак і падаць да ўрока рускай мовы ў гатовым выглядзе.

3. Торт «Прыемнасць». 5 стаканаў жадання, 4 — ведаў, 3—кемлівасці, 2 — узаемаразумення (як з боку настаўніка, так і вучняў, таму ўсяго ўзяць удвайне), пасыпаць «5»-мі і добра перамяшаць.

Прыемнага апетыту!

**Парадамі бабулі Галі падзялілася А. Казімірчык, СШ № 19.**

# Педагагічная практыка — крок да самапазнання і самавызначэння

Год таму на занятках па ўзроставай і педагагічнай псіхалогіі я неаднаразова звярталася да студэнтаў з такімі пажаданнямі: «Гэта вам дапаможа...», «На практыцы ўсё паспрабуеце...», ці«Вы сутыкнецеся з першых дзён у школе з такой з'явай...». Хацелася прадухіліць тыя памылкі, якія традыцыйныя ў практыцы студэнтаў, а яшчэ больш — перасцерагчы ад першых расчараванняў і няўдач. Добра разумею, як важна, каб гэтага не здарылася, каб практыка выклікала імкненне да самаўдасканалення, да спасціжэння ведаў у дні і тыдні, што засталіся.

І вось спроба сваіх сілаў і магчымасцей адбылася. Без фальшывай стрыманасці спроба высокай якасці. Папершае, таму што філолагаў добра рыхтуюць да практыкі: і змястоўна, і эмацыянальна. Неяк асабліва добразычліва, зацікаўлена, клапатліва. Атмасфера канферэнцыі натхніла, не страшыла: ахоплены ўсе аспекты дзейнасці практыкантаў. І што неабходна заўважыць: адхінуты супярэчнасці ва ўстаноўках кіраўнікоў практыкі, іх пазіцыі блізкія і адэкватныя мэтам і задачам практыкі.

Яркія, самабытныя і таленавітыя студэнты былі ў маёй групе ў СШ № 16. В. Барысюк, А. Згірская, В. Несцер, Т. Рабчук, Т. Пышкіна ведаюць і любяць рускую мову, творча ставяцца да ўрокаў, не капіруюць адзін аднаго. Шукалі шляхі, каб выклікаць здзіўленне вучняў, абудзіць іх да думкі, да пошуку. Мне асабліва прыемна адзначыць, што яны добра разумеюць вучняў, абсалютна канкрэтныя і добразычлівыя. Не сакрэт, што сучасныя школьнікі ў многіх выклікаюць раздражненне. Нічога падобнага ў сваіх практыкантаў я не заўважыла.

Я думаю, што студэнткі адкрылі для сябе не толькі дзяцей, але і саміх сябе, сфарміравалі упэўненае сваё «я». Без такога «я» у школе вельмі цяжка, толькі зносіны са школьнікамі зацвярджаюць у нас педагагічную самакаштоўнасць, фарміруюць наша прафесіянальнае крэда.

Цудоўны педагог Ганна Яфімаўна Чэк, апекавалася студэнткамі. Колькі цярплівасці, энергіі, гарэння! Такі настаўнік пакідае след на ўсё жыццё.

Мяне, як псіхолага, заўсёды хвалюе: ці ёсць у будучых бацькоў жаданне спасцігнуць унутраны свет дзяцей, ці не прымаюць яны гэты свет павярхоўна? Магу адказаць, што ў данай групе мае хваляванні не апраўдаліся.

Можна шмат гаварыць аб выніковай канферэнцыі. Тут таксама няма схемы: ёсць спроба закрануць патаемнае. Каштоўным мне бачыцца і ўдзел у канферэнцыі студэнтаў трэцяга курса. Як да іх звярталіся педагогі, а якія каштоўныя і добрыя парады гучалі з вуснаў тых, хто прайшоў педагагічную практыку. Значыць, для многіх час да педпрактыкі стане прадуктыўным накапленнем ведаў, удасканаленнем сябе як асобы.

**В. БАГАСЛОЎСКАЯ,**
**дацэнт кафедры псіхалогіі.**

**Не выключана, што пасля сканчэння універсітэта, каму-небудзь давядзецца тут працаваць.**

*Сочинение-описание*

# Памятник А. С. Пушкину в Москве

Москва. Пушкинская площадь. На этой площади стоит возглавленный Пушкину памятник.

В 1076 году был создан проект памятника Пушкину. Его возглавляли 3 года, 3 раза подряд. Но потом приехал туда архитектор Опекушин, и благодаря ему они все-таки возглавили памятник. Этот памятник он создал после долгого просмотра проектов других скульпторов.

6 июня 1980 года памятник имени Пушкина был открыт.

И вот теперь стоит памятник на красивой площади, всем людям пример, что надо любить наших писателей.

За памятником растут деревья, что придает памятнику более красивый, более строгий вид. Вокруг него расположен кинотеатр «Россия». И здесь же, на площади, горят фонари. Чтоб люди замечали памятник Пушкину.

На бронзовом памятнике во весь рост стоит А. С. Пушкин. Лицо его, при необыкновенном физическом сходстве, безоблачно, но серьезно.

Бронзовый Пушкин одет элегантно. Он стоит в пальто, штанах, в туфлях. Голова немного наклонена, с вечной шляпой в руке. Сам Пушкин изображен в необычной позе, словно скульптор поймал его в тот момент, когда он в задумчивости гуляет по парку, отошедший от внешнего мира. Он прогуливается по этому парку, в котором стоит ему памятник.

Он размышляет над своими мыслями, а, может быть, думает, как красивее сложить стихотворение. Он даже ногу вперед выставил. В эти минуты к нему пришли его лучшие стихи.

Стоит он в такой позе уже около ста лет.

Сбоку у памятника висит такая табличка, на которой написаны имена и фамилии тех писателей, которые дружили с Пушкиным. У его подножия никогда не вянут живые цветы.

Эта скульптура не роскошь, это искусство, принадлежащее всем. Сюда приходят, чтобы временно забыться и хорошо отдохнуть.

Раз проникнув в нашу душу, Пушкин уже никогда не покидает ее, а поселяется в сознании нашем и живет там, как дома,— удивительно смело, непринужденно, уютно.

Это ваяние произвело огромное впечатление на меня и моих друзей.

**Сачынне з сачыненняў вучняў 8-х класаў. Настаўнікі рускай мовы І. Лось, А. Шалесная, Л. Худзякова.**



## Хто не разгубіўся ў жыцці?

Кожны год нясе з сабой нешта новае, новае ў поглядах на жыццё, новыя подыхі ў модзе. І сёлетні — не выключэнне. Думаю, не памылюся, калі скажу, што зараз для многіх стала прэстыжным і асабліва модным мець інамарку, валюту, дарагую вопратку і ўвогуле весці «прыгожы» вобраз жыцця.

Памятаю, калі мы, выпускнікі універсітэта, сканчаючы вучобу, марылі аб працы ў школе, аб любові дзяцей да настаўніка, да свайго прадмета, стараліся данесці сваім вучням думку аб тым, што галоўнае ў жыцці — стаць Чалавекам выхаваным, інтэлігентным, паважаючым сябе і іншых. А што здарылася зараз, дзе нашы студэнты, чым яны жывуць і што прапаведуюць?

Задаць вам і сабе гэтыя пытанні падштурхнула сустрэча з былым аднакурснікам, з якім разам скончылі універсітэт, а цяпер, як сказалі аб ім сябры, «крутым пацаном».

А справа была такая. Не сакрэт, што мы, у асноўным, апранаемся цяпер на знакамітым гродзенскім рынку. Іду, аглядаючы заваленыя ўсялякай усячынай на любы густ гандлёвыя рады — раптам — знаёмы твар «прадаўца». Ба, гэта ж Лёха! Запакаваны з ног да галавы ў імпартовыя рэчы, гандлюючы кітайскім шырпатрэбам, з дошкай на шыі «Куплю даляры, маркі, літы». Ну і ну, і гэта наш Лёха!

Сустрэча была хаця і выпадковай, але развесяліла нас: «Лёшка, ты б яшчэ да дошкі аб'яў званочак на шыю павесіў, цябе б увогуле чутно не было!» Вядома, мы разгаварыліся, перарываючы, праўда, гаворку адказамі на пакупны попыт аб цэнах на тавары.

— Лёха, якім чынам ты тут апынуўся? Ці не ты ўжо ў студэнцкія гады працаваў у школе?

— А што школа? Глупства ўсё гэта. Што патрэбна для шчасця? Грошы, смачная ежа, утульная хаціна. Нічога гэтага я там не меў. Я на рынку добра «намётваю» за дзень. Пачынаў з дробязі ў «камку», потым — прадаў бацькоўскую машыну, ...Польшча, Турцыя, Кітай, Друскенікі, Вільня, Піцер, Масква — убачыў за некалькі месяцаў столькі гарадоў.

Ён пачаў пералічваць шматлікія назвы менавіта гандлёвых славутасцей за мяжой, назвы крамаў, гатэляў, рынкаў. Толькі потым я зразумела, што нідзе, дарэчы, акрамя гэтых «выдатных» мясцінаў, ён не паспеў (ці не хацеў паспець). Але затое з лёгкасцю падлічыў і параўнаў усе курсы валют з нашымі «зайцамі».

— Ты колькі маеш у месяц ад сваёй працы? — пытаецца ён у мяне.

— Ну тысячаў так...

— Тысячаў? Ха-ха. Купі клёвую шмотку на свае тысячы. Я маю на ўвазе ў баксах.

Мне на хвіліну стала няёмка ад усведамлення таго, што, відаць, не шмат чаго ці ўвогуле нічога не куплю...

— Для мяне кошт рэчы, кошт аўто — не праблема, — працягвае мой знаёмы. Я жыву па прынцыпу: «Хто не працуе, той не есць». А ці не работа гэта — цэлы дзень гандляваць на рынку? Мая жонка не крыўдуе на мяне...

Аляксей з прыгожай бутэлькі налівае ў шклянку рому, запіхвае ў рот бутэрброд, мабыць, з ікрой і задаволена ўсміхаецца. А я, адмовіўшыся ад пачастунку, у роздуме адыйшла ад новаяўленага бізнесмена. У галаве сумбурныя думкі не давалі мне пакою: ці патрэбна вышэйшая адукацыя, каб лічыць грошы ў сваёй кішэні; хто не разгубіўся ў гэтым жыцці: гандляр з базару ці выкладчык і ўрач; хто больш стабільна адчувае сябе ў цяперашні час? А пра духоўныя каштоўнасці ўвогуле не вядзецца гаворка...

**Н. ДУДКО.**

## ПАМЯЦІ ФІЛОЛАГА



**Многія вучоныя прысвячаюць сваё жыццё філалогіі, але толькі тых, хто сказаў сваё адметнае слова ў гэтай навуцы, можна назваць Філолагамі з вялікай літары. Адзін з іх жыў і працаваў з намі. Заклаўшы асновы намінатыўнай дэрывацыі, прафесар В. М. Нікіцевіч істотна пашыраў межы традыцыйнай дэрываталогіі. Яго працы далі імпульс зусім новым даследаванням лінгвістаў, і дагэтуль усе патэнцыяльныя магчымасці тэорыі дэрывацыйнай граматыкі В. М. Нікіцевіча яшчэ не вычарпаны. На вялікі жаль, Васіль Міхайлавіч не паспеў рэалізаваць усе свае навуковыя планы, хаця працаваў да апошняга дня свайго такога кароткага і так раптоўна абарванага жыцця.**

**Як любы сапраўды вялікі вучоны, Васіль Міхайлавіч быў вельмі сціплым чалавекам, і гэта сціпласць уводзіла ў зман многіх з яго акружэння, хто не быў здольны зразумець усю глыбіню яго тэарэтычных распрацовак.**

**В. М. Нікіцевіч быў высокаадукаваным чалавекам, валодаў дарам прадбачання. Яго цікавілі ўсе навейшыя плыні ў лінгвістыцы. Ён не стамляўся вучыцца новаму і, што самае галоўнае, вучыць другіх. Таму ён заўсёды знаходзіў агульную мову з кожным зацікаўленым у развіцці філалагічнай навукі і таму стварыў навуковую школу, самастойны напрамак у лінгвістыцы.**

**Са смерцю Васіля Міхайлавіча філалогія страціла таленавітага Філолага, вучні — Настаўніка, калегі — Сябра, а ўсе мы — Чалавека. Вечная яму памяць.**

**КАЛЕГІ ПА ПРАЦЫ.**

## Ці ёсць мафія ў інтэрнаце ў Ялонках?

Увесь час пад канец мінулага семестра да нас даходзілі сігналы аб «цяжкіх бойках», якія адбываліся ў інтэрнаце ў Ялонках. Апавядалі нават аб мафіі, якая быццам б'е студэнтаў. Маецца на ўвазе руская мафія, якая ўтварылася сярод студэнтаў, але, дзякуй Богу, абыходзіцца без аўтаматаў Калашнікава, аднак кулакі ў яе членаў не менш эфектыўныя і застаўляюць пасля сябе сляды з ненатуральным сінім адценкам. Кажуць таксама, што калі нават хтось «выпадкова» трапіць у недавер сваім рускім прыяцелям, то яны з задавальненнем могуць перацягнуць кіем, альбо нават здольныя і на тое, каб спраўдзіць вастрыё свайго нажа. Узначальвае мафію жахлівы касавокі студэнт з далёкай нам Азіі — відавочна, таксама расійскамоўны. Інфармацыя, якая трапіла да нас самымі рознымі шляхамі, аднак таксама не пацвярджаецца канкрэтнымі фактамі. Па іх праверцы выявілася, што ад «Ялонкаўскіх» рускіх можна дастаць па твару таксама, як і ад любога іншага жыхара Ялонак, зрэшты, як і ад усіх навокал. Усё гэта ўвасоблена, на жаль, у агульнапрынятых нормах пэўнай часткі людзей у нашым грамадстве. Да гэтай групы, на жаль, далучаюцца нават некаторыя студэнты. Усё па прынцыпу: «калі што не падабаецца, дык адразу ў дзюбу». Бойка з нажамі таксама мела месца, але біліся гэта студэнты з Афрыкі, а не рускія. А мафіі студэнтаў расійскамоўных у інтэрнаце ў Ялонках наогул не можа быць і мовы, паколькі праводзяць яны свой час толькі ў сваім цесным асяроддзі, і гэта цалкам натуральна, дарэчы, аб гэтым сведчыць і сацыялогія. Студэнты з былога СССР пачуваюцца сярод не сваіх не вельмі ўтульна і нават чужаюцца. Найлепей ім ў сваім родным асяродку. А тое, што яны, як і ўсе астатнія, любяць выпіць, ну дык што ж, у такой сітуацыі прычынаў для авантуры знайсці няцяжка. І відавочна, што да боек даходзіць толькі дзякуючы гарэлцы і прычым п'юць яе шмат. Рэдка здараецца, каб якія-небудзь непаразуменні здараліся на цвярозую галаву.

Так кожны міф становіцца выкрытым. Аднак гэта не азначае, што сярод рускамоўных студэнтаў няма такіх, якія з'яўляюцца членамі той самай «сур'ёзнай мафіі». Падчас канікулаў шмат хто з іх вяртаецца назад з «хадавым» таварам. У больш сур'ёзных выпадках у адзін бок дастаўляюцца аўтамабілі, а назад, да прыкладу, гарэлка. Нам вядомы адзін выпадак са студэнтам, які перад тым, як прыехаць вучыцца ў Польшчу, ваяваў у Афганістане ў Чырвонай Арміі. Яго мінулае, а таксама некаторыя «дзіўныя» кантакты як бы папярэджваюць аб асцярожных адносінах з ім. Усё гэта прыклады выключныя. Тыя, хто парушае закон, не зацікаўленыя ў тым, каб выявілі іх. Падобна, што яны не ставяць мэты рабаваць у інтэрнатах і тэрарызаваць студэнтаў. Па гэтаму трэба быць спакойнымі. Калі наб'е нас мафіозі, то зробіць гэта не з прычыны прафесійнай, а хутчэй прыватнай.

**«Auditorium».**

## Як студэнт з рэктарам

Як нам стала вядома, у хуткім часе ў Казіміраўскім палацы павінен адкрыцца новы кабінет — прыёмная прарэктара па справах студэнтаў, у якім ён будзе весці прыём.

Як вядома, у прарэктара па справах студэнцкіх вырашаюцца самыя складаныя, невычарпальныя пытанні. Шмат для каго з студэнтаў прарэктар з'яўляецца апошняй інстанцыяй да каго можна звярнуцца з самымі складанымі праблемамі. Новы кабінет-прыёмная прыдуманы дзеля таго, каб усе самыя цяжкія размовы адбываліся ў спрыяльнай для студэнтаў атмасферы, без лішняй увагі і бюракратычнай валакіты. Тады лягчэй будзе зразумець адзін аднаго і вырашыць нават самыя складаныя справы, якія ёсць у студэнта.

**«Auditorium».**

## У фізікаў з гумарам усё ўпарадку

На фізічным факультэце адбыліся традыцыйныя Дні фізікі. Мне давялося прысутнічаць на заключнай гумарыстычнай вечарыне. У апошні час мы вельмі рэдка ўсміхаемся, а той, хто трапіў да фізікаў, будзе доўга памятаць, як А. М. Каладзінскі перадаваў эстафетны сцяг факультэта Г. А. Гачко, зачытаўшы загад № 0 па стварэнню на базе кафедры агульнай фізікі партызанскай брыгады...

А потым у запоўненай зале не спыняўся шчыры смех: выступаў артэль «Німфа» і студэнцкі тэатр «Канкан». Цікавай і разнастайнай была іх праграма: паказалі, як робіцца на тэлебачанні рэклама, рэпартаж з кабінету псіхіятра, мініяцюры на тэму паводзінаў і выкладчыкаў у час экзаменаў, сцэны з жыцця студэнцкага інтэрната № 3, прыемна ўразіла і выступленне пачынаючага гітарыста А. Ячкоўскага за кампазіцыяй «Сантэхнік».

Асаблівую ўвагу залы выклікалі рамансы, складзеныя любімымі выкладчыкамі ў цудоўным выкананні трупы: А. В. Нікіцін, Г. А. Гачко, А. М. Каладзінскі, А. М. Сянько, С. А. Маскевіч.

«Брава!» — дзякавалі прысутныя «вялікім гумарыстам-фізікам»: А. Аўхімкову, С. Вянсковічу, М. Захарэвічу, В. Максімовічу, А. Ячкоўскаму, А. Глебаву, П. Курбаеву, В. Мілюку.

Цяжка было не ўзняцца з месца і не далучыцца да танцавальнага дуэта прыгажуні горада Гродна Іны Гардзейка і А. М. Каладзінскага, асабліва маленькім дзецям, якія таксама прысутнічалі на вечарыне і з вялікай цікавасцю глядзелі на сцэну...

Дзякуй фізікам за тое, што яны падарылі нам сваім задорным гумарам столькі радасці і цудоўнага настрою.

**Н. ПЯТРОВА.**

## Дні біёлага — адметныя дні

Традыцыйныя Дні біёлага прысвячаліся сёлета дзесяцігоддзю біялагічнага факультэта. Дастойна адзначылі тут юбілей.

Прайшла сур'ёзная навуковая канферэнцыя студэнтаў, на якой з грунтоўнымі дакладамі і паведамленнямі выступілі многія будучыя біёлагі. На канферэнцыі працавалі секцыі па біяхіміі, экалогіі і біялогіі.

Да дзесяцігоддзя факультэта была прымеркавана і навуковая канферэнцыя выкладчыкаў. На ёй прагучалі матэрыялы па найбольш важных накірунках навуковай дзейнасці біяфака.

Што яшчэ было ў праграме Дзён біёлага? Гэта і сустрэча з былымі выпускнікамі, і міні-аўкцыён, і... канцэрт, у якім удзельнічалі «лепшыя сілы» біяфака. Канцэртам завяршалася юбілейная праграма.

**К. МЛЫНСКІ.**

## Навіны спорту

У Мінску адбыліся студэнцкія гульні па кулявой стральбе. Паспяхова выступіла студэнтка I курса факультэта фізвыхавання Людміла Барэйша. Яна стала двухкратнай чэмпіёнкай гульняў. У адным з практыкаванняў Люда выканала нарматыў майстра спорту.

■

Таксама ў сталіцы Беларусі адбыліся студэнцкія гульні па барацьбе самба сярод мужчын. Каманда універсітэта (трэнер І. Э. Шарко) заняла другое агульнакаманднае месца. Чэмпіёнкамі гульняў сталі Валеры Лерман і Юры Лысенка (факультэт фізвыхавання).

■

У г. Гомелі прайшлі студэнцкія гульні па гандболу сярод жаночых каманд. Каманда нашага універсітэта заняла трэцяе месца, згуляўшы ўнічыю з камандай Акадэміі фізвыхавання і спорту і праіграўшы камандзе Гомельскага універсітэта. Трэнер каманды Гродзенскага універсітэта — М. Ф. Бура.

■

У Мінску адбыліся студэнцкія гульні па валейболу сярод мужчынскіх і жаночых каманд. Найбольш паспяхова выступіла каманда мужчын, якая ўзнялася на другое месца спартыўнага гонару. Трэнер — А. А. Паняшын. Пятае месца — у каманды жанчын, трэнер — А. У. Мацюк.

■

З 28 сакавіка па 5 красавіка 1994 г. у спартыўнай зале універсітэта прайшло першынство па валейболу сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў у праграме спартакіяды «Здароўе». У ім прымалі ўдзел каманды шасці факультэтаў. У аднакругавым турніры першае месца ў каманды факультэта фізвыхавання, другое месца — у каманды юрыдычнага факультэта, трэцяе — у філолагаў.

■

21 красавіка адбудзецца агульнаўніверсітэцкі вясенні лёгкаатлетычны крос. У спаборніцтвах прымуць удзел зборныя каманды факультэтаў, выкладчыкі і супрацоўнікі.

**Спортклуб.**

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць два разы на месяц
Аб'ём газеты — адзін друкаваны аркуш

Газета надрукавана афсетным спосабам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні
г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 15.00.

Рэгістрацыйнае пасведчанне 421

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
ВУЧОНАЯ РАДА УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ

Зак. 1958

Тыраж 500 асобнікаў

Рэдактар
М. КАРНЕВІЧ